● *Сустрэчы на Замкавай*

# «Душа, як птушка, узнясецца»

**У літаратурна-мастацкім салоне "Сустрэчы на Замкавай" пры цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Герцэна адбылася прэзентацыя кнігі паэзіі "Выток пачуццяў" члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Лідзіі Возісавай.**



"Душа, як птушка, узнясецца...", – сцвярджае Лідзія Возісава. І сапраўды, яна валодае здзіўляючым дарам – зараджаць усіх, хто з ёй сутыкаецца, энергіяй, аптымізмам, падымаць настрой. Яна заўсёды знаходзіць новыя і новыя крыніцы натхнення, якія дапамагаюць не толькі пісаць вершы, але і пераадольваць розныя неблагапрыемныя жыццёвыя абставіны.

У яе творчасці прысутнічае тэма любові да роднай зямлі, да родных каранёў, ад якіх немагчыма адарвацца, якія цягнуць да сябе зноў і зноў і, здаецца, у якую б частку свету ты ні паехаў, але ж заўсёды вернешся сюды. Туды, дзе "трос чубам выспелы авёс", дзе "шчарбаты рот сняжынкам... горад падстаўляў", дзе "слязою бруднай плача снег".

У Лідзіі Возісавай адна за адной выйшлі тры кнігі паэзіі: "Прызнанне", "Касание Перста", "Слелы". Яна актыўна друкавалася ў рэспубліканскім і мясцовым друку, у Расіі. Асабліва хвалююць паэтэсу маральна-этычныя праблемы ўзаемаадносін чалавека і грамадства.

...Не кляніце нікога,
Не зласлоўце, хай ворагі кпяць –
Бо ўсе словы даходзяць да Бога,
А затым бумерангам ляцяць.

На прэзентацыі прагучалі песні на словы Лідзіі Возісавай, пакладзеныя на музыку Аленай Кастэнка.

**Наталля МАЛАШЭНКА,**
**загадчык аддзела ЦГБ імя Герцэна.**